**24.** Дадзены паняцці: *а) тэма; б) ідэя; в) праблема.*

Суаднясіце паняцці і іх значэнні:

*1) асноўнае жыццёвае пытанне, якое пісьменнік ставіць у творы, на якое звяртае ўвагу чытача;*

*2) тое, пра што ідзе размова ў творы, што ў ім паказваецца;*

*3) асноўная думка, што вынікае з усяго паказанага, вывад, выснова, якую робіць чытач, пазнаёміўшыся з творам.*

**А)** а-1, б-2, в-3. **Б)** а-2, б-3, в-1. **В)** а-2, б-1, в-3.
**Г)** а-3, б-2, в-1. **Д)** а-3, б-1, в-2.

---

**25.** Вызначце правільна ўтвораныя прыналежныя прыметнікі.

*1) бабулькава; 2) сястрын; 3) рыбакоў.*

**А)** усе прыметнікі. **Б)** няма такіх прыметнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**26.** Дадзены сказы: *1. Між вольна пачалі ўспамінаць радасныя падзеі.*
*2. Яська шмат народных песень ведаў напамяць.*
*3. Марос за ноч размаляваў шыбы.*

У якім сказе(-ах) ёсць слова(-ы), напісанае(-ыя) няправільна?

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такога сказа. **В)** у 1. **Г)** у 2. **Д)** у 3.

---

**27.** Вызначце з прапанаваных прыкладаў правільна ўтвораныя словазлучэнні.

*1) дзякаваць бабулі; 2) схадзіць за хлебам;*
*3) думаць пра добрае; 4) загадчык бібліятэкай.*

**А)** усе прыклады. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**28.** Хто з’яўляецца аўтарам вершаваных радкоў?

*Радзіма мая дарагая,*
*Ты ў шчасці жаданым жыві.*
*Я сэрцам табе прысягаю*
*У шчырай сыноўняй любві.*

**А)** Максім Багдановіч. **Б)** Якуб Колас. **В)** Пятрусь Броўка.
**Г)** Алесь Ставер. **Д)** Алесь Бачыла.

---

**29.** Дадзены ўстойлівыя спалучэнні на рускай мове:
*а) ни жарко ни холодно; б) ни с того ни с сего; в) живот подвело.*

Падбярыце адпаведнікі на беларускай мове:

*1) духі сцягнула; 2) ні свярбіць ні баліць; 3) без нічога ніякага.*

**А)** а-1, б-2, в-3. **Б)** а-2, б-3, в-1. **В)** а-2, б-1, в-3. **Г)** а-3, б-2, в-1. **Д)** а-3, б-1, в-2.

---

**30.** Хто з вядомых мастакоў слова быў у 1914 годзе галоўным рэдактарам дзіцячага часопіса “Лучынка”?

**А)** Цётка. **Б)** Янка Купала. **В)** Ян Чачот.
**Г)** Максім Багдановіч. **Д)** Янка Лучына.

---

КОНКУРС

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Інтэлектуальныя спаборніцтвы «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/
Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 6. Тыраж 7100 экз. Мінск. 2025 г.

Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры

# «БУСЛІК-2025»

*Чацвер, 13 лютага 2025 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 9 класа

**1.** Назва якога народнага свята прапушчана ў радках песні?

*А на …*
*Рана сонца іграла –*
*Рана сонца іграла,*
*На добрыя годы…*

**А)** Каляды. **Б)** Дабравешчанне. **В)** Купалле. **Г)** Вялікдзень. **Д)** Грамніцы.

---

**2.** Колькі назоўнікаў ужыта ў вершаваных радках Янкі Купалы?

*Тут пад кожным курганом і каменем*
*Ці быліны, ці казка чароўная.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**3.** Вызначце з прапанаваных словы, у якіх на канцы вымаўляецца [*х*].

*1) гарох; 2) пірог; 3) рэйтынг.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**4.** Дадзена загадка: *Фыркае, рыкае, галіны ламае, пыл падымае, цябе з ног збівае, чуеш яго, ды не бачыш.*

Знайдзіце адгадку ў пераблытаных літарах.

**А)** о, ь, с, л. **Б)** о, ь, н, к. **В)** р, у, ш, а, н, к. **Г)** е, р, е, ц, в. **Д)** а, д, ё, ы, р.

**5.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце літару ***е***?

*1) м..даль; 2) л..свіца; 3) г..рой; 4) ве..р.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 3, 4.

---

**6.** У слове *грыб**н**ы* выдзеленая літара з’яўляецца … .

**А)** прыстаўкай. **Б)** суфіксам. **В)** канчаткам. **Г)** постфіксам. **Д)** коранем.

---

**7.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце літару ***а***?

1) *світ..р; 2) крат..р; 3) лід..р; 4) орд..р.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 3, 4.

---

**8.** Вызначце правільна напісаныя лічэбнікі.

*1) семь; 2) восемдзесят; 3) шасцідзясяты.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**9.** Чым з’яўляецца выдзеленае спалучэнне слоў у сказе?

*У парку кружылася жоўтае лісце, **асыпаючыся з дрэў**.*

**А)** параўнаннем. **Б)** дзеепрыметнікавым зваротам.
**В)** дзеепрыслоўным зваротам. **Г)** устаўной канструкцыяй.
**Д)** пабочным словазлучэннем.

---

**10.** Вызначце з прапанаваных няпэўна-асабовы сказ.

*1. Усіх запрашаюць у музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.*
*2. Не рабі ліхога і не бойся нікога. 3. Варта наведаць тэатр.*

**А)** усе сказы. **Б)** няма такога сказа. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**11.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце раздзяляльны мяккі знак (**ь**)?

*1) іл..ка; 2) дас..е; 3) аб..явіць; 4) медал..ён.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 3. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 2, 4.

---

**12.** Вызначце з прапанаваных словы, у якіх гукаў больш, чым літар.

*1) яе; 2) ясень; 3) грэе; 4) амаль.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 4.

---

**13.** Дадзены сказ:

*У Петруся заўсёды знаходзілася нагода **зубы паскаліць**.*

Якім членам сказа з’яўляецца выдзеленае ўстойлівае спалучэнне?

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** дапаўненнем.
**Г)** азначэннем. **Д)** акалічнасцю.

---

**14.** Выберыце з прапанаваных незваротныя дзеясловы.

*1) схаваўся; 2) прачнуцца; 3) пасябравалі; 4) убачыў.*

**А)** усе дзеясловы. **Б)** няма такіх дзеясловаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**15.** Які знак прыпынку прапушчаны ў сказе з простай мовай?

*“Унучак, будзь уважлівы на ўроках, – сказаў дзядуля і дадаў –*
*Слухай настаўніка!”*

**А)** коска. **Б)** кропка. **В)** працяжнік. **Г)** двукроп’е. **Д)** двукоссе.

---

**16.** Дадзены назоўнікі: *1) кансіліум; 2) завязь; 3) таварышч; 4) пяшчаны.*
Выберыце правільна напісаныя прыклады.

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільна напісаных прыкладаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**17.** Дадзены сказы:

*1. Шчырае сяброўства. 2. Хлопчык кемлівы. 3. Сустрэча запомнілася.*

Вызначце двухсастаўны(-ыя) сказ(-ы).

**А)** 1. **Б)** 1, 2. **В)** 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3.

---

**18.** Дадзены словы на рускай мове: *пицца, аккордеон, аббревиатура*.
Вызначце правільна напісаны(-ыя) адпаведнік(-і) на беларускай мове.

*1) піцца; 2) акардыён; 3) абрэвіатура.*

**А)** усе адпаведнікі. **Б)** няма такіх. **В)** 1. **Г)** 2, 3. **Д)** 3.

---

**19.** Дадзены дзеясловы:

*а) узнімаць; б) ставіць; в) трапляць.*

Падбярыце да іх назоўнікі, каб утварыліся ўстойлівыя спалучэнні.

*1) у адзін рад; 2) у пастку; 3) да нябёс.*

**А)** а-1, б-2, в-3. **Б)** а-2, б-3, в-1. **В)** а-2, б-1, в-3.
**Г)** а-3, б-2, в-1. **Д)** а-3, б-1, в-2.

---

**20.** Словы *праўда – выдумка* з’яўляюцца … .

**А)** сінонімамі. **Б)** антонімамі. **В)** амонімамі. **Г)** паронімамі. **Д)** амафонамі.

---

**21.** Выдзеленае слова ў сказе з’яўляецца … .

***Рассыпаны** зоркі брыльянтавым пухам.* (Якуб Колас)

**А)** назоўнікам. **Б)** прыметнікам. **В)** дзеясловам.
**Г)** дзеепрыметнікам. **Д)** дзеепрыслоўем.

---

**22.** Якое сапраўднае прозвішча аўтара паэмы “Тарас на Парнасе”?

**А)** Ігнацьеў. **Б)** Васільеў. **В)** Афанасьеў. **Г)** Луцэвіч. **Д)** Міцкевіч.

---

**23.** Вызначце тып сказа:

*Колас любіў чыстыя баравыя лясы, дзе прасторна воку, дзе над галавой ніколі не змаўкае вячысты гоман хвойных вяршынь, дзе ў дастатку паветра і сонца* (М. Лынькоў).

**А)** просты. **Б)** складаназлучаны. **В)** складаназалежны.
**Г)** бяззлучнікавы. **Д)** сказ з рознымі відамі сувязі.